ПАДЗЕЯ

# ПРЫВІТАННЕ Ў ВЕЧНАСЦЬ

**У Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А. Макаёнка адбыўся вечар памяці пісьменніцы Марыі Цітарчук (1985-2021).**



**Для даведкі.** *Цітарчук Марыя Раманаўна нарадзілася 20 ліпеня 1985 года ў Гродне. Скончыла рамана-германскае аддзяленне філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый», а таксама магістратуру філфака ГрДУ імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «Літаратура народаў краін замежжа». Працавала малодшым навуковым супрацоўнікам у аддзеле рэдкай кнігі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Пачала пісаць вершы і прозу з 1995 года. Выдала кнігі: «Вераснёўскія мроі» (2008), «В лучах серебряного сна» (2010), «Феи приходят в полночь» (2012). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пайшла з жыцця 8 лютага 2021 года. Прычынай смерці сталі наступствы перанесенага каронавірусу.*

Памяць... Пра яе мы чуем і думаем кожны дзень. І зусім не выпадкова. Гістарычная памяць – наша базавая каштоўнасць, сродак нацыянальнай, самаідэнтыфікацыі, грамадскай кансалідацыі, падмурак для гарманічнага існавання і развіцця дзяржавы. Трапяткая павага да мінулага фактычна становіцца нацыянальнай ідэяй беларусаў. Гэта наш генэтычны код. Але ствараюць яго маленькія, светлыя астраўкі памяці пра кожнага з нас, пра нашых родных і блізкіх, калег і сяброў. Без мноства асобных жыццёвых сюжэтаў, якія з цеплынёй захоўваюць нашы сэрцы, наша агульная, усенародная памяць немагчымая. Гэта той зямны след, што застаецца ад чалавека пасля яго сыходу ў вечнасць. З такіх слядоў вытканая ўся наша гісторыя. Не сакрэт, што многія імкнуцца жыць з клопатам аб тым, што будзе пасля нас. Але чалавеку ўласціва жыць проста дзеля жыцця, жыць тут і цяпер, напаўняць зместам, цаніць кожнае жыццёвае імгненне ва ўсёй яго разнастайнасці, не зазіраючы далёка за гарызонт…

21 кастрычніка ў чытальную залу галоўнай бібліятэкі горада над Нёманам успомніць Марыю Цітарчук прыйшлі яе калегі і сябры, сябры сям'і пісьменніцы, прадстаўнікі культурнай грамадскасці, зацікаўленая моладзь. Летам гэтага года Марыя магла б адзначыць сваё саракагоддзе, яе жыццёвы шлях абарваўся вельмі рана, як кажуць, на самым узлёце. Але засталіся светлыя ўспаміны пра гэтага цікавага і глыбокага творчага чалавека. Усе ўдзельнікі мерапрыемства былі адзіныя ў думцы аб тым, што для Марыі было ўласціва нетрывіяльнае

ўспрыманне рэчаіснасці, яна жыла ва ўласным свеце з мар і фантазій, адрознівалася арыгінальным эстэтычным стылем, усім сэрцам любіла родны горад, любіла мастацтва, любіла ўсё прыгожае, узнёслае, казачнае. Пісьменніцу можна лічыць сапраўдным рамантыкам, летуценнікам, а таксама патрыётам, інтэлектуалам. У ходзе мерапрыемства прагучалі яе паэзія і проза. Сярод выступоўцаў – старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Людміла Кебіч; музычны педагог, кампазітар Ірына Траццяк; бібліятэкар Іна Прасолава; ветэран педагагічнай працы Ніна Домань; сябры Марыі: музычны педагог Іна Шахно; выкладчык ГрДУ імя Янкі Купалы Ганна Крофта; універсітэцкі настаўнік Марыі Святлана Тарасава; калегі-пісьменнікі: Вольга Алізар, Ірына Салата, Дзмітрый Радзівончык, Святлана Глембоцкая, Станіслаў Вішнеўскі і іншыя. Выступленні дапаўняла дэманстрацыя фотаздымкаў з цытатамі. Гродзенцы згадвалі, якой Марыя Цітарчук была ў жыцці і творчасці, падкрэслівалі адметныя рысы яе шматграннай асобы. Было сказана пра адмысловую музычнасць слова Марыі. Бясспрэчна – у пісьменніцы быў вялікі творчы патэнцыял, але, на жаль, трагічны лёс перашкодзіў яго максімальнай рэалізацыі.







У прамовах выступоўцаў адчуваліся цеплыня, шчырасць і вядома, сум. Людміла Антонаўна распавяла пра сваё знаёмства з Марыяй. Ірына Траццяк расказала пра песеннае супрацоўніцтва з паэтэсай і зачытала ліст ад маці Марыі – Веры Міхайлаўны, якая жыве за мяжой. Дарэчы, на вечары памяці адбылася прэзентацыя кнігі Веры Цітарчук «Музыка души моей». Багата ілюстраваны фотаздымкамі зборнік кранальных успамінаў пра Марыю, а таксама твораў паэтэсы, песень на яе словы Вера Міхайлаўна прысвяціла дачцэ і яе светлай памяці. У відэафармаце аўдыторыі прадставілі некалькі песень на словы Марыі Цітарчук (музыка Ірыны Траццяк). Атмасфера вечара атрымалася вельмі кранальнай (некаторыя выступоўцы не змаглі стрымаць слёз) і вельмі душэўнай, без усялякага намёку на жалобу. Некаторыя апісаныя эпізоды з дзяцінства Марыі нават выклікалі шчырыя ўсмешкі на тварах. Вобраз нашай маладой, таленавітай калегі Марыі Цітарчук і памяць пра яе ў гэты вечар духоўна зблізілі і аб'яднаалі ўсіх, хто знаходзіўся ў зале. З упэўненасцю можна сцвярджаць: калі мы гаворым «памяць», маем на ўвазе *чалавечнасць.*

Нагадаем, што вечар памяці гродзенскай пісьменніцы Марыі Цітарчук прайшоў у межах Тыдня бацькоўскай любові і стаў чарговым мерапрыемствам з цыкла «Яны ўзбагацілі літаратуру Гродзеншчыны».

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** эпізоды і ўдзельнікі вечара памяці пісьменніцы Марыі Цітарчук пад назвай «Музыка маёй душы» з цыкла «Яны ўзбагацілі літаратуру Гродзеншчыны». Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, 21 кастрычніка 2025 года.







Людміла Кебіч: прэзентацыя кнігі Веры Цітарчук «Музыка души моей»



Вядучая мерапрыемства, бібліятэкар Іна Прасолава


Гучыць проза Марыі Цітарчук







Музычны педагог, кампазітар Ірына Траццяк



Ірына Траццяк: прэзентацыя кнігі Веры Цітарчук



Дзмітрый Радзівончык – пра творчасць Марыі Цітарчук



Гучаць вершы Марыі Цітарчук. Паэтэса Вольга Алізар


Ніна Домань



Празаік Ірына Салата



Сяброўка пісьменніцы Ганна Крофта



Святлана Тарасава



Іна Шахно



Выступае Святлана Глембоцкая



Станіслаў Вішнеўскі










Старанна падрыхтаваная супрацоўнікамі бібліятэкі выстава выданняў і публікацый прынёманскіх аўтараў







[Відэаверсія мерапрыемства]

[Тэлепраграма «ЛітАратар. Марыя Цітарчук»]

Фота: *Анатоль Апанасевіч*



Марыя Цітарчук. У нашай памяці назаўжды…